# GRAMMAR REFERENCE

## UNIT 1

### The verb “need” / Дзеяслоў “need”

Дзеяслоў **need** мае двайную прыроду і можа выкарыстоўвацца як мадальны дзеяслоў “трэба” і як сэнсавы дзеяслоў “мець патрэбу”, “патрабавацца”.

Як мадальны дзеяслоў ён выказвае неабходнасць выканання дзеяння або яго адсутнасць і можа выкарыстоўвацца толькі ў адмоўных і пытальных сказах у цяперашнім часе:

***Need*** *I read it now? – Ці мне **трэба** чытаць гэта зараз?*
*You **needn’t** read it now. – Табе **не трэба** чытаць гэта зараз.*

Звярніце ўвагу на выкарыстанне розных мадальных дзеясловаў у станоўчым і адмоўным адказе на пытанне з дзеясловам **need**:

***Need*** *we read it now? – **Yes**, you **must**.*
*                                  **No**, you **needn’t**.*

Мадальны дзеяслоў **need** мае толькі адну форму. Пасля яго ідзе дзеяслоў у неазначальнай форме без часціцы **to**:

*You **needn’t** read it now. He **needn’t** read it now.*

(Няправільна: ~~*He **needs not** read it now*~~.)

***Need*** *I read it now? **Need** he read it now?*

Як сэнсавы дзеяслоў **need** можа прымаць канчатак “**-s**” у форме 3-й асобы адзіночнага ліку. Пасля яго ідзе дзеяслоў у неазначальнай форме з часціцай **to.** Для ўтварэння адмоўнай і пытальнай формаў выкарыстоўваецца дапаможны дзеяслоў **do / does** (у цяперашнім часе).

| + | ? | – |
|---|---|---|
| *I **need** to read it now.* | ***Do** you **need** to read it now?* | *You **don’t need** to read it now.* |
| *He **needs** to read it now.* | ***Does** he **need** to read it now?* | *He **doesn’t need** to read it now.* |

### The modal verb “ought (to)” / Мадальны дзеяслоў “ought (to)”

Мадальны дзеяслоў **ought (to)** выкарыстоўваецца для перадачы рэкамендацыі або парады. Па сэнсе ён падобны да дзеяслова **should**, які выкарыстоўваецца часцей і перадае больш суб’ектыўнае меркаванне. Дзеяслоў **ought (to)** мае на ўвазе больш настойлівую рэкамендацыю.

*You **ought to** join the club. – Вам **варта** стаць членам гэтага клуба.*

Гэты мадальны дзеяслоў мае толькі адну форму. Пасля яго выкарыстоўваецца дзеяслоў у неазначальнай форме з часціцай **to** (у адрозненне ад **should**).

| **+** | **?** | **–** |
|---|---|---|
| *You **ought to** join the club.*<br>*You **should** join the club.* | ***Ought** he **to** go there now?*<br>***Should** you join the club?* | *They **oughtn't to** do it now.*<br>*You **shouldn't** join the club.* |

## Infinitive and Gerund / Інфінітыў і герундый

Інфінітыў (**Infinitive**) – гэта пачатковая форма дзеяслова. Яна можа ўжывацца з часціцай **to** або без яе:

*I can't **swim** but I want **to learn**. – Я не ўмею **плаваць**, але хачу **навучыцца**.*

Герундый (**Gerund**) – гэта асаблівая форма дзеяслова, якая ўтвараецца прыбаўленнем канчатка "**-ing**" да асновы:

*read – read**ing***

У беларускай мове такой часціны мовы няма. На беларускую мову герундый можа перакладацца неазначальнай формай дзеяслова або аддзеяслоўным назоўнікам:

*He likes **swimming**. – Яму падабаецца **плаванне**. = Ён любіць **плаваць**.*

| **Герундый (V + ing)** | **Інфінітыў без "to"** | **"To" + інфінітыў** |
|---|---|---|
| • пасля дзеясловаў "can't stand", "dislike", "enjoy", "hate", "like", "love", "mind", "prefer", "practise":<br>*I like **swimming.***<br>• пасля прыназоўнікаў:<br>*I'm fond of **swimming**;*<br>• герундый выступае як дзейнік:<br>***Swimming** is great.* | • пасля мадальных дзеясловаў: "can", "could", "should", "must", "will", "would", "need":<br>*I can swim very well.*<br>акрамя: "have to", "ought to":<br>*You ought **to learn** to swim.* | • пасля дзеясловаў: "agree", "advise" (smb), "decide", "hope", "learn", "offer", "want", "would like / prefer", "encourage" (smb), "need" (сэнсавы дзеяслоў):<br>*I want **to swim**.*<br>• тлумачыцца мэта дзеяння:<br>*He trained a lot **to win** the race.*<br>• пасля канструкцыі «**It + be + прыметнік**»:<br>*It was great **to swim** in the lake on a hot day.* |

# Revision of the tenses / Паўтарэнне часавых формаў дзеяслова

## Present Simple

| + | ? | - |
|---|---|---|
| S **$V_1$ / V+s** … . | **Do / does** S $V_1$ … ? | S **don’t / doesn’t $V_1$** … . |
| *Students **wear** uniform.*<br>*It **starts** in September.* | ***Do** students **wear** masks?*<br>***Does** it **start** in August?* | *They **don’t wear** masks.*<br>*It **doesn’t start** in August.* |
| **Signal words:** always, often, usually, sometimes, never, every day / week / month / year. | | |
| **Function:** to describe:<br>1. regular, repeated actions or states;<br>2. future timetabled actions;<br>3. if-clauses in Conditionals 0 and 1. | | |
| **Formula:** $V_1$ / V+s | **Scheme:** past — **x** now — future | |

## Past Simple

| + | ? | - |
|---|---|---|
| S **V+ed ($V_2$)** … . | **Did** S **$V_1$** … ? | S **didn’t $V_1$** … . |
| *She **jumped** for joy.*<br>*They **heard** the news.* | ***Did** she **jump** for joy?*<br>***Did** they **hear** the news?* | *She **didn’t jump** for joy.*<br>*They **didn’t hear** the news.* |
| **Signal words:** yesterday, last week, a month ago, in 2010, the other day. | | |
| **Function:** to describe:<br>1. an action that happened at a definite time in the past;<br>2. a chain of chronological events. | | |
| **Formula:** V+ed ($V_2$) | **Scheme:** **x** past — now — future | |

## Future Simple

| + | ? | - |
|---|---|---|
| S **will $V_1$** … . | **Will** S **$V_1$** … ? | S **won’t $V_1$** … . |
| *They **will come** soon.* | ***Will** they **be** late?* | ***They** won’t **be** late.* |
| **Signal words:** tomorrow, next week | | |
| **Function:** to describe an action that will probably happen at a definite time in the future. | | |
| **Formula:** will $V_1$ | **Scheme:** past — now — **x** future | |

## Present Continuous

| + | ? | - |
|---|---|---|
| S **am / is / are V+ing** | **Am / is / are** S **V+ing ?** | S **am / is / are not V+ing** |
| *I'**m looking** forward to it.*<br>*He **is studying.***<br>*They **are playing.*** | ***Am** I **looking** forward to it?*<br>***Is** he **playing**?*<br>***Are** they **studying**?* | *I'**m not looking** forward to it.*<br>*He **isn't playing**.*<br>*They **aren't studying**.* |
| **Signal words:** now, at the moment, these days, nowadays | | |
| **Function:** to describe:<br>1. an event that is happening now;<br>2. an arrangement or a personal plan for the future. | | |
| **Formula:** am / is /are V+ing | **Scheme:**  | |

## Past Continuous

| + | ? | - |
|---|---|---|
| S **was / were V+ing** | **Was / were** S **V+ing ?** | S **was / were not V+ing** |
| *She **was dancing**.*<br>*We **were singing**.* | ***Was** she **singing**?*<br>***Were** we **dancing**?* | *She **wasn't singing**.*<br>*We **were not dancing**.* |
| **Signal words:** at 5 o'clock yesterday, at this time yesterday, when (mum came), while, as | | |
| **Function:** to describe:<br>1. an action in progress at a stated past time;<br>2. a past action in progress interrupted by another past action;<br>3. 2 or more actions happening at the same time. | | |
| **Formula:** was / were V+ing | **Scheme:**  | |

## Present Perfect

| + | ? | - |
|---|---|---|
| S **have / has $V_3$** | **Have / has** S **$V_3$?** | S **have / has not $V_3$** |
| *He **has done** it.*<br>*We **have done** it.* | ***Has** she **done** it?*<br>***Have** they **done** it?* | *She **hasn't done** it.*<br>*They **haven't done** it.* |
| **Signal words:** never, always, ever, so far, already, yet, still, just, for 3 days, since 2000 | | |
| **Function:** to describe:<br>1. an event that has happened once or several times during a period of time up to now;<br>2. an event that has happened at an unstated time in the past and has an important result in the present time. | | |
| **Formula:** have / has $V_3$ | **Scheme:**  | |

## Present Perfect Continuous

| + | ? | - |
|---|---|---|
| S **have / has been V+ing** | **Have / has** S **been V+ing?** | S **have / has not been V+ing** |
| *She **has been reading**.*<br>*They **have been playing**.* | ***Has** she **been reading**?*<br>***Have** they **been playing**?* | *She **hasn't been reading**.*<br>*They **haven't been playing**.* |
| **Signal words:** for 3 days, for ages, all day, since my childhood, recently | | |
| **Function:** to describe:<br>1. an action that started in the past and continues up to now;<br>2. an unfinished action in the past. | | |
| **Formula:** have / has been V+ing | **Scheme:**  | |

## Present Simple Passive

| + | ? | - |
|---|---|---|
| S **am / is / are V3** | **Am / Is / Are** S **V3 ...?** | S **am not / isn't / aren't V3** |
| *The song is **rung**.*<br>*Guests **are invited**.* | *Is the song **sung**?*<br>***Are** guests **invited**?* | *The song isn't **rung**.*<br>*Guests **aren't invited**.* |
| **Function:** when the agent is unknown, unimportant or obvious from the context. | | |

## Past Simple Passive

| + | ? | - |
|---|---|---|
| S **was / were V3** | **Was / Were** S **V3 ...?** | S **wasn't / weren't V3** |
| *The camp **was set** up.*<br>*The presents **were opened**.* | ***Was** the camp **set** up?*<br>***Were** the presents **opened**?* | *The camp **wasn't set** up.*<br>*The presents **weren't opened.*** |
| **Function:** when it is not important or known who did the action. | | |

# UNIT 2

## Reflexive pronouns / Зваротныя займеннікі

Калі ў сказе дзейнік і дапаўненне з'яўляюцца адной і той жа асобай, у беларускай мове мы ўжываем займеннік “сябе” або прыбаўляем да дзеяслова зваротную часціцу “-сь/-ся”. У англійскай мове гэта робіцца з дапамогай зваротных займеннікаў. У адрозненне ад беларускай мовы ў англійскай мове іх восем, і яны павінны ўзгадняцца з дзейнікам. Зваротныя займеннікі ўтвараюцца ад прыналежных або асабістых займеннікаў у аб'ектным склоне з дапамогай прыбаўлення часціцы “**-self**” для адзіночнага ліку і “**-selves**” для множнага ліку.

| **subject** | *I* | *you* | *she* | *he* | *it* | *we* | *you* | *they* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **reflexive** | *my**self*** | *your**self*** | *her**self*** | *him**self*** | *it**self*** | *our**selves*** | *your**selves*** | *them**selves*** |

***I*** *was not careful when cooking and cut* ***myself****.* – ***Я*** *была неўважлівая пры гатаванні і парэзала****ся****.*

*How did* ***he*** *cut* ***himself****? – Як* ***ён*** *парэзаў****ся****?*

У спалучэнні з прыназоўнікам **by** займеннікі азначаюць “адзін”, “без кампаніі”.

*She lived* ***by herself****. – Яна жыла* ***адна****.*

Звярніце ўвагу на пераклад некаторых ідыём з выкарыстаннем зваротных займеннікаў:

*Help yourself to the cake. – Частуйся тортам.*
*Make yourself at home. – Адчувай сябе як дома.*
*Enjoy yourselves! – Весяліцеся! / Забаўляйцеся!*

Аднак поўнай адпаведнасці паміж зваротнымі дзеясловамі ў беларускай мове і ужываннем зваротных займеннікаў з дзеясловамі ў англійскай мове няма. У англійскай мове зваротныя займеннікі не ўжываюцца пасля такіх дзеясловаў, як *feel, hide, concentrate, relax, decide, meet, hurry, stand up, shave, wash, dress.*

*Concentrate! – Сканцэнтруйся!* (Няправільна: ~~*Concentrate* ***yourself****!*~~)
*I feel good. – Я адчуваю* ***сябе*** *добра.* (Няправільна: ~~*I feel* ***myself*** *good.*~~)

Калі размова ідзе пра маленькіх дзяцей або жывёл, то дапушчальна ўжываць зваротны займеннік:

*Katie isn't big enough to dress herself. She's just 7 months old.*

Акрамя таго, зваротныя займеннікі могуць падкрэсліць, што дзеянне перададзена самастойна, без пабочнай дапамогі. У такім выпадку на беларускую мову яны перакладаюцца з дапамогай слоў “сам”, “сама”, “самі”:

*I did it* ***myself****. – Я зрабіла гэта* ***сама****.*

Зваротныя займеннікі могуць таксама выкарыстоўвацца пасля назоўнікаў ці асабовых займеннікаў, каб падкрэсліць, што гаворка ідзе менавіта аб названых, а не якіх-небудзь іншых людзях або рэчах:

*The dish **itself** was delicious.* – ***Сама** страва была смачнай.*
*She **herself** gave me the recipe / invited us to dinner.* – *Яна **сама** дала мне рэцэпт / запрасіла нас на абед.*

## Articles with meals / Артыклі з назоўнікамі, якія абазначаюць прыёмы ежы

Такія назоўнікі, як **breakfast**, **brunch**, **lunch**, **dinner**, **supper**, **tea** абазначаюць прыём яды і пададзеную ежу.

Звычайна яны ўжываюцца без артыкля (нулявы артыкль), калі проста называюць прыём яды і прывязаныя да часу яе прыёму. У гэтым выпадку яны часцей за ўсё ўжываюцца пасля такіх дзеясловаў, як **have, take, cook, serve, prepare,** і прыназоўнікаў **at, for, before, after**:

*Who usually cooks **breakfast** for you?*
*I'm hungry. What's for **dinner** tonight?*

**Неазначальны артыкль** ужываецца з гэтымі назоўнікамі, калі перад імі стаіць апісальнае азначэнне:

*I prefer to have **a** hearty **breakfast**.*

**Азначальны артыкль** ужываецца, калі гаворка ідзе аб ежы, прыгатаванай да самога прыёму яды, ці маецца абмежавальнае азначэнне:

***The dinner** he cooked was unexpectedly tasty.*

У словазлучэннях **the first / second dish** таксама традыцыйна выкарыстоўваецца артыкль **the**.

# UNIT 3

## Present Perfect and Present Perfect Continuous in comparison / Параўнанне Present Perfect і Present Perfect Continuous

Трывальна-часовыя формы Present Perfect і Present Perfect Continuous маюць прынцыповыя адрозненні.

| Present Perfect | Present Perfect Continuous |
|---|---|
| I / вы / мы / they **have** $V_3$<br>he / she / it **has** $V_3$ | I / вы / мы / **they have been V+ing**<br>he / she / it **has been V+ing** |
| Апісвае дзеянне, якое здзейснілася адзін або некалькі разоў за названы перыяд (ад пэўнага моманту ў мінулым да цяперашняга часу):<br>*He has won in the lottery three times.*<br><br>now | Апісвае дзеянне, якое пачалося ў мінулым і працягваецца да цяперашняга часу:<br>*He has been buying lottery tickets for two years.*<br><br>2 years ago now |
| Акцэнт робіцца на вынік, на тое, колькі зроблена:<br>*He is tired because he has cleaned five rooms.*<br>***How many**? – Five rooms.* | Акцэнт робіцца на працэс, на працягласць дзеяння:<br>*He is tired because he has been cleaning the rooms since morning.*<br>***How long**? – Since morning.* |
| Дзеянне ўжо здзейснілася | Дзеянне здзяйсняецца да гэтага часу |
| Ужываецца замест Present Perfect Continuous са статычнымі дзеясловамі *love, want, like, see, hear, know, seem, believe* | НЕ ўжываецца са статычнымі дзеясловамі *love, want, like, see, hear, know, seem, believe* |

## Comparison with “as ... as ...” / Параўнальная канструкцыя “as ... as ...”

Для параўнання прадметаў можна выкарыстоўваць канструкцыю “as + прыметнік + as”, якая азначае “такі ж (прыметнік), як”:

*Our bank is as old as yours. – Наш банк такі ж стары, як і ваш.*

Гэтая канструкцыя часта выкарыстоўваецца ў фразеалагізмах:

*Aspoor s as a church mouse – бедны як царкоўная мыш.*
*As easy as ABC – проста як два ў два.*
*As busy as a bee – вельмі заняты.*
*As safe as the Bank of England – вельмі надзейны і бяспечны.*

## Articles with substantivised adjectives / Артыкль з субстантываванымі прыметнікамі

Некаторыя прыметнікі могуць перайсці ў разрад назоўнікаў, калі перад імі выкарыстаць пэўны артыкль. У такім выпадку яны будуць называць групу людзей, аб'яднаных некаторай прыметай.

*The rich – багатыя.*
*The poor – бедныя.*
*The old – старыя.*

Выказнік пасля такіх слоў ужываецца ў множным ліку:

*The British **are famous** for being polite. – Брытанцы **вядомыя** сваёй ветлівасцю.*

# UNIT 4

## Questions / Пытанні

Для англійскага сказа вельмі важны парадак слоў. У сцвярджальным сказе дзейнік заўсёды ставіцца перад выказнікам. Такі парадак слоў называецца прамым (**direct word order**).

Пры пабудове пытанняў змяняецца парадак слоў: сам выказнік (*am, is, are, was, were*), мадальны дзеяслоў (*can, could, must, should, may*) або адпаведны дадзенай трывальна-часовай форме дапаможны дзеяслоў (*do, does, did, have, has, will, am, is, are, was, were*) ставіцца перад дзейнікам. Змяненне парадку слоў (**inversion**) адбываецца пры пабудове агульнага (**yes / no questions**), альтэрнатыўнага (**or-questions**) і спецыяльнага (**wh-questions**) пытанняў.

| Type of question | Question word | Auxiliary verb | Subject | (Aux.) + main verb | Or... |
|---|---|---|---|---|---|
| **Statement** | - | - | + | *(Aux.)+ main verb* | - |
| **Yes / no question** | - | *Auxiliary* | + | *Main verb* | - |
| **Or-question** | - | *Auxiliary* | + | *Main verb* | + |
| **Wh-question** | *Question word* | *Auxiliary* | + | *Main verb* | - |

Звярніце ўвагу, што пры пабудове альтэрнатыўнага пытання “or + альтэрнатыва” ставяцца непасрэдна пасля слова, да якога даецца выбар:

***We celebrate** his birthday every year.*

| **Агульнае пытанне** | ***Do we celebrate** his birthday every year?* |
|---|---|
| **Альтэрнатыўнае пытанне** | ***Do we celebrate** or forget about his birthday every year?*<br>***Do we celebrate** his or her birthday every year?*<br>***Do we celebrate** his birthday or his victory every year?*<br>***Do we celebrate** his birthday every year or not every year?* |
| **Спецыяльнае пытанне** | *What **do we celebrate** every year?*<br>*When **do we celebrate** his birthday?*<br>*How **do we celebrate** his birthday every year?* |

Пытанне да дзейніка ў адрозненне ад вышэй апісанага выпадку задаецца з прамым парадкам слоў. Для гэтага неабходна:

- замяніць дзейнік на пытальнае слова **who / what**;
- выказнік перапісаць, паставіўшы ў форму 3-й асобы адзіночнага ліку.

Аналагічнае мы назіраем у беларускай мове:

***We celebrate*** *his birthday every year. – Мы* ***адзначаем*** *яго дзень нараджэння кожны год.*

***Who celebrates*** *his birthday every year? – Хто* ***адзначае*** *(3-я. ас. адз. л.) яго дзень нараджэння кожны год?*

## Conditional 0 / Умоўны сказ нулявога тыпу

Умоўны сказ нулявога тыпу выкарыстоўваецца для апісання навуковых фактаў, бясспрэчных ісцін, падзей або з’яў, якія заўсёды з’яўляюцца праўдзівымі. Ён складаецца з дзвюх частак: галоўнага сказа (**main clause**) і залежнага (**if-clause**), якія злучаюцца злучнікамі **if**, **unless** або **when**.

Мы выкарыстоўваем злучнік **when**, калі практычна ўпэўненыя, што дзеянне ў залежным сказе абавязкова адбудзецца. Калі існуе толькі магчымасць здзяйснення дзеяння ў залежным сказе, то выкарыстоўваецца **if**. Злучнік **unless** азначае “**if + ...not**”.

Азнаёмімся з наступнымі сказамі:

***When*** *he comes. –* ***Калі*** *ён прыйдзе. (дакладна вядома, што ён прыйдзе)*
***If*** *he comes. –* ***Калі*** *ён прыйдзе. (ён можа і не прыйсці)*
***Unless*** *he comes. –* ***Калі*** *ён* ***не*** *прыйдзе. (яго прыход будзе нечаканасцю)*

Парадак частак умоўнага сказа можа мяняцца. Залежны сказ аддзяляецца коскай, толькі калі ён стаіць перад галоўным сказам. Звычайна ў абедзвюх частках ужываецца дзеяслоў у Present Simple. Давайце параўнаем:

*I always walk to school* ***unless*** *I am late.*

***If*** *I am late, I take a bus.*

***When*** *it rains, it pours.*

Для перадачы правілаў, інструкцый, просьбаў і парадаў у галоўным сказе часцей выкарыстоўваецца загадная форма дзеяслова:

*Don’t use your phone if you are in class.*

*If you are sick, go to the doctor.*

## Conditional I / Умоўны сказ першага тыпу

Умоўны сказ першага тыпу выкарыстоўваецца для апісання рэальнай і магчымай сітуацыі ў будучыні: дзеянне адбудзецца ў будучыні, калі будзе выканана названая ўмова. Так, як і ўмоўны сказ нулявога тыпу, ён складаецца з двюх частак: галоўнага сказа (**main clause**) і залежнага (**if-clause**), аб’яднаных злучнікамі **if**, **unless** або **when.**

У галоўным сказе, які называе рэзультат, выкарыстоўваецца Future Simple. У залежным сказе ў адрозненне ад беларускай мовы ўжываецца дзеяслоў у Present Simple. Давайце параўнаем:

*We will watch the fireworks* ***if*** *the weather is fine. – Мы паглядзім феерверк,* ***калі*** *надвор’е будзе добрым.*

***If*** *you drink much coffee, you won’t sleep at night. –* ***Калі*** *будзеш піць шмат кавы, ноччу не заснеш.*